Источник: “Звязда” – 2018-05-30

Прамкампаніі з 11 краін сабраліся ў Мінску

У краіне створаны ўмовы для развіцця прамысловасці за кошт інвестыцый і інавацый. Пра гэта падчас цырымоніі адкрыцця Беларускага прамысловага форуму ў мінскім Футбольным манежы заявіў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка. Паводле яго слоў, тэмп росту прамысловай вытворчасці за студзень — красавік сёлета ў Беларусі склаў 108,8 %. Ва ўрадзе разлічваюць, што на аналагічным паказчыку будзе скончаны гэты год.

Кажучы аб прамысловым форуме, віцэ-прэм'ер адзначыў, што гэтае мерапрыемства ўжо зарэкамендавала сябе як пляцоўка, дзе спецыялісты могуць абмяняцца думкамі, прадэманстраваць свае дасягненні і выгадна прадаць распрацоўкі.

Беларускі прамысловы форум праходзіць у сталіцы з 29 мая па 1 чэрвеня. Цэнтральнае месца тут займае XXI Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «ТэхІнаПрам», дзе абмяркоўваецца тэма чацвёртай прамысловай рэвалюцыі (Industry 4.0). На форуме прадстаўлены экспаненты з 11 краін.

Мінпрамам сумесна з НАН Беларусі і Мінскім гарвыканкамам запланавана спецыялізаваная экспазіцыя, прысвечаная развіццю легкавога аўтамабілебудавання, вытворчасці электрамабіляў і рынку аўтакампанентаў. «Кіруючая кампанія холдынга «Белкамунмаш» разам са «Штадлер Мінск» арганізуюць у павільёне і на адкрытай пляцоўцы «ТэхІнаПрам» сумесную экспазіцыю сучасных і перспектыўных транспартных сродкаў і сістэм, накшталт электробусаў, хуткасных трамваяў, найноўшых тралейбусаў, аўтобусаў з дызельным і газаматорным рухавікамі, рухомых чыгуначных саставаў, вагонаў метро.